ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар
Установы “Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры”
______________ С.І.Усік

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Старшыня
Мінскага абласнога аддзялення грамадскага аб’яднання “Саюз пісьменнікаў Беларусі”
____________ Л.М.Крыванос

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік
аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі
Капыльскага раённага выканаўчага камітэта
_____________ Л.М.Юха

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення па адукацыі, спорце і турызме
Капыльскага раённага выканаўчага камітэта
_____________ А.А.Карповіч

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб правядзенні творчага конкурсу**
**“Родныя мае мясціны…”, прысвечанага 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і жыццю і творчасці беларускага пісьменніка Кузьмы Чорнага**

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Творчы конкурс **“Родныя мае мясціны…”** (далей – Конкурс) праводзіцца з мэтай фарміравання патрыятызму, прывіцця любові і павагі да роднага краю.

1.2. Асноўнымі задачамі Конкурсу з’яўляюцца:

- папулярызацыя і развіццё беларускай літаратуры;
- развіццё пазнавальнай цікавасці да творчасці Кузьмы Чорнага;
- фарміраванне каштоўнасных адносін да гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа;
- выяўленне і заахвочванне таленавітых навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, фарміраванне матывацыі да актыўнай творчай дзейнасці;
- стварэнне аптымальных умоў для творчага развіцця і рэалізацыі творчага патэнцыялу дзяцей і моладзі;
- прыцягненне ўвагі грамадскасці да важнасці літаратурнай і мастацкай творчасці.

## 2. АРГАНІЗАТАРЫ КОНКУРСУ

Установа “Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры”, Мінскае абласное аддзяленне грамадскага аб’яднання “Саюз пісьменнікаў Беларусі”,

аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі і ўпраўленне па адукацыі, спорце і турызме Капыльскага раённага выканаўчага камітэта.

## 3. УДЗЕЛЬНІКІ КОНКУРСУ

3.1. Да ўдзелу ў Конкурсе запрашаюцца навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі, выхаванцы ўстаноў культуры Капыльскага раёна Мінскай вобласці.

3.2. Конкурс праходзіць у двух намінацыях: "Літаратурная творчасць" і "Выяўленчае мастацтва".

3.3. Конкурс праходзіць у наступных узроставых катэгорыях:

10 гадоў – 14 гадоў;

15 гадоў – 18 гадоў.

## 4. АФАРМЛЕННЕ ТВОРЧЫХ РАБОТ

4.1. **Патрабаванні да афармлення конкурсных работ намінацыі "Літаратурная творчасць":**

тэкст павінен быць аформлены на старонках у фармаце А4, у рэдактары WORD, шрыфт Times New Roman, кегль 14, інтэрвал адзінарны;

тытульны ліст з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, назвы твора і яго жанра.

Прымаюцца літаратурныя творы: вершы, апавяданні, эсэ (аб'ём – да 3 лістоў).

4.2. Дасылаючы на Конкурс твор, удзельнік гарантуе, што з'яўляецца яго аўтарам і не парушае аўтарскіх правоў іншых асоб.

4.3. Аргкамітэт не разглядае творы, у якіх выкарыстоўваецца ненарматыўная лексіка, гучаць заклікі да насілля або міжнацыянальнай, міжканфесійнай варожасці.

4.4. **Патрабаванні да афармлення конкурсных работ намінацыі "Выяўленчае мастацтва":**

ілюстрацыі да твораў пісьменніка; малюнкі, прысвечаныя мясцінам, звязаным з жыццём і творчасцю Кузьмы Чорнага;

выкананне работ у розных тэхніках жывапісу і графікі любымі матэрыяламі: гуаш, акварэль, алей, пастэль, крэйды, аловак і інш.;

памер творчых работ не больш, чым 50х70 см.

Асноўнымі крытэрыямі ацэнкі работ з'яўляюцца адпаведнасць тэме Конкурса, мастацкі і тэхнічны ўзровень выканання творчай працы, арыгінальнасць, культура афармлення.

Да кожнай работы з адваротнага боку павінна быць прымацаваная этыкетка памерам 5х10 см з наступнымі звесткамі:

прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара (цалкам);

узрост;

назва работы;

прозвішча, імя і імя па бацьку педагога (цалкам);
назва ўстановы адукацыі і клас (або творчае аб'яднанне).

## 5. АРГАНІЗАЦЫЯ, УМОВЫ І ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

5.1. Да ўдзелу ў Конкурсе дапускаюцца прадстаўленыя ў тэрмін творчыя работы, змест якіх адпавядае зацверджаным намінацыям Конкурсу, паводле сапраўднага палажэння.

5.2. Ад аднаго аўтара прымаецца не больш за 1 (адну) творчую заяўку.

5.3. У Конкурсе ўдзельнічаюць раней не друкаваныя і не выстаўленыя творчыя работы.

5.4. Удзельнікі Конкурсу даюць сваю згоду на апрацоўку сваіх персанальных дадзеных: прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост і іншых персанальных дадзеных.

5.5. Конкурс праводзіцца ў адзін тур **з 22 красавіка па 31 мая 2024 года**. Вынікі Конкурсу будуць падведзены **да 3 чэрвеня 2024 года.**

Выстава творчых работ удзельнікаў Конкурсу пройдзе:

у філіяле “Літаратурны музей Кузьмы Чорнага” падчас правядзення літаратурна-музычнага свята “Цімкавіцкія вытокі” 8 чэрвеня 2024 года.

5.6. Заяўкі на ўдзел (Дадатак) разам з творчымі работамі неабходна прыносіць **да 31 мая 2024 года** ў Капыльскую раённую цэнтральную бібліятэку імя А.Астрэйкі па адрасе: вул. Замкавая, 1а; тэлефон для даведак: 55-5-33, 54-7-85.

## 6. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І ЎЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

6.1. Конкурсныя работы ацэньвае кампетэнтнае журы, у склад якога ўваходзяць навуковыя супрацоўнікі ўстановы “Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры”, члены Мінскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання “Саюз пісьменнікаў Беларусі”, педагогі ўстаноў адукацыі Капыльскага раёна.

6.2. У кожнай намінацыі прызначаецца па 3 прызавых месцы (I, II і III месца). Пераможцы атрымаюць дыпломы і памятныя падарункі.

6.3. Урачыстае ўручэнне дыпломаў (падзяк) адбудзецца **8 чэрвеня 2024 года** падчас правядзення літаратурна-музычнага свята “Цімкавіцкія вытокі” ў аг. Цімкавічы.

6.4. Арганізацыйным камітэтам могуць быць прадугледжаны спецыяльныя прызы ў рамках асобных намінацый конкурсу:

за творчы падыход і арыгінальнасць задумкі;

за высокае выканальніцкае майстэрства;

за захаванне гістарычнай памяці і мастацкую выразнасць.

Дадатак

Заяўка
на ўдзел у творчым конкурсе "Родныя мае мясціны…", прысвечаным жыццю і творчасці беларускага пісьменніка Кузьмы Чорнага

Назва намінацыі ____________________.

Назва творчай работы ________________________.

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара (цалкам).
2. Месца пражывання.
3. Назва ўстановы адукацыі і клас.
4. Кантактны тэлефон, адрас, е-мэйл.
5. Узроставая катэгорыя.
6. Прозвішча, імя, імя па бацьку настаўніка/кіраўніка творчага аб'яднання (цалкам).

***Подпіс кіраўніка ўстановы адукацыі***